


Падзея

# САЮЗ ТВОРЦАЎ І МУЗ

## Дызайнеры і мастакі падорацць натхненне гледачам

**11 мая ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы стартуе «Тыдзень моды і сучаснага мастацтва ў Беларусі — Belarus Fashion Art Week». Па задумцы арганізатараў, дзясяты сезон праекта павінен прадэманстраваць, на што здольныя беларускія дызайнеры і мастакі. Цікава, што гэтай вясной модныя паказы плануецца спалучаць з выставамі мастацкіх работ, выкананых не ў наватарскай, а ў традыцыйнай манеры, з выкарыстаннем нацыянальных мастацкіх прыёмаў і глыбока беларускіх вобразаў.**

### МОДА ЯК МАСТАЦТВА

Ці можа мода лічыцца адным з відаў сучаснага мастацтва? Адназначнага адказу на гэтае пытанне, мабыць, не існуе. З аднаго боку, мода настолькі глыбока інтэграваная ў сучаснасць, што асацыіруецца з чымсьці часовым, мімалётным і пераменлівым, і наогул яна — «пра вонкавае, павярхоўнае». А мастацтва — гэта ж «пра душу» і «пра вечнае»: «Мона Ліза», «Таемная вячэра», «Лебядзінае возера» або, скажам, творы класікаў літаратуры па-за любой модай, бо яны вышэй за яе. З іншага боку, тыя, хто шчыра здзіўляецца, паглядзеўшы паказ «ад куцюр» («Для каго такое адзенне? Як можна ў такім выглядзе выйсці на вуліцу?), проста трапляюць у сэнсавую пастку. Яны разлічвалі ўбачыць прыкладную моду, якую можна вось проста ўзяць і перанесці ў штодзённасць, а дызайнер падышоў да пытання з пункту гледжання мастацтва: мадэлі на подыуме — чыстае палатно для выяўлення мастацкай ідэі майстра (няхай з дапамогай дызайну адзення і з улікам тэндэнцый сезона), а зусім не дапаможнік на тэму «Як апрануцца праз пару тыдняў, калі пацяплее/пахаладае, каб выглядаць стыльна і актуальна». Наогул, адказ на пытанне, ці з'яўляецца мода відам сучаснага мастацтва, яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя далі вядучыя дызайнеры сусветных брэндаў. Яны прызналі сябе мастакамі, а выставы, прысвечаныя калабарацыі моды з рознымі відамі мастацтва, ужо ў 1970—1980-х паступова пачалі станавіцца, як цяпер бы сказалі, мэйнстрымам. Садзейнічала гэтаму і паступовая страта мастацтвам арэолу элітарнасці, яго дэмакратызацыя. Лозунг «Мастацтва ў масы», права на роўны доступ да яго для ўсіх пластоў насельніцтва абвясцілі яшчэ ў 1920-х, а ў нашы дні прынты знакамітых палотнаў і цытаты класікаў упрыгожваюць цішоткі і шоперы. Спусцілася з высокіх подыумаў і элітарная мода — калекцыі «ад куцюр» брэнды час ад часу запускаюць у масавую вытворчасць. З іншага боку, любое мастацтва элітарнае па сваёй сутнасці: можна ўбачыць вялікую карціну ці скульптуру, нават купіць яе (тэарэтычна, вядома), але немагчыма набыць яе разуменне.

Эпоха інтэрнэту пераасэнсавала практычна ўсе культурныя коды старэйшых пакаленняў. Сёння кожны сам сабе пісьменнік або журналіст, паэт, кампазітар ці мастак, прычым аўдыторыя ў «сусветным павуцінні» знойдзецца для ўсіх. Некалі, больш за сто гадоў таму, французскі тэарэтык мастацтва Марсэль Дзюшан задаўся пытаннем «Што робіць мастацтва мастацтвам?», і яго адказ быў такі: «...цяпер любы аўтар мае права назваць мастацтвам усё, што прыйдзе яму на розум, і твор у гэтым выпадку будзе актам яго творчай волі». У нашы дні блогеры і «вулічныя мастакі», якія ўпрыгожваюць графіці сцены дамоў, ажыццявілі яго запаветы.


Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Дык ці від мастацтва мода? Чаму б і не. Нават калі вы перакананы, што прадметы гардэроба апрыёры не могуць несці ў сабе нейкіх глыбокіх сэнсаў, то, прынамсі, мастацтва і мода заўсёды ідуць поплеч, а дызайнеры чэрпаюць натхненне ў жывапісе, графіцы, скульптуры, тэатры і балеце і нават у архітэктуры.

### АКЦЭНТ — НА ТРАДЫЦЫІ

Але вернемся да Belarus Fashion Art Week. У ліку асноўных задач праекта, як расказаў адзін з арганізатараў тыдня моды, **член Беларускага саюза дызайнераў Дзмітрый КРАСОЎСКІ,** — якраз даказаць, што мода мае права называцца відам мастацтва.

— Мы хацелі б, каб мода ў нашым грамадстве ўспрымалася як катэгорыя культуры і мастацтва, — падкрэсліў ён. — Сярод задач мерапрыемства таксама — падтрымка маладых таленавітых дызайнераў нашай краіны, прадстаўнікоў іншых відаў мастацтва ў мэтах забеспячэння прафесійнай пераемнасці. Нараўне з маладымі дызайнерамі мы запрашаем брэнды, якія зарэкамендавалі сябе, каб адбываўся абмен вопытам, — патлумачыў Дзмітрый Красоўскі. — Сярод прадстаўнікоў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, чые работы будуць прадстаўлены на мерапрыемстве, таксама ёсць і моладзь, і вядомыя мастакі.

— Калі я ўпершыню прыняла ўдзел у гэтым праекце, прапанова спачатку падалася мне нечаканай, — расказвае **мастак па тэкстылі, член Беларускага саюза мастакоў Марыя БАРЫСЕНКА.** — Тэкстыль, безумоўна, блізкі модзе, але былі сумневы, як упішуцца мае работы ў фэшн-мерапрыемства. І ўсё ж я вырашыла пайсці на гэты эксперымент. Сінтэз мастацтваў — гэта цікавы вопыт: калі яны сустракаюцца, нараджаецца нешта новае. З часам ідэя вырасла ў праект не аб модзе, а ў цэлым аб сучасным мастацтве. А ў гэтым сезоне яго арганізатары пайшлі яшчэ далей — вырашылі зрабіць акцэнт на традыцыйнае мастацтва.

Работы для прадстаўлення аўдыторыі ў Купалаўскім тэатры ў рамках Belarus Fashion Art Week адабраны сучасныя, расказала мастак па тэкстылі, але ў традыцыйнай для нашай культуры тэхніцы. Што яшчэ раз падкрэслівае — гэта Тыдзень менавіта нашай, беларускай моды, дадала яна.

— Для мяне вельмі адказна прадставіць свае работы на «Тыдні моды і сучаснага мастацтва», — зазначае **маладая мастачка Вікторыя ПАЛІЎКА.** — Я працую ў традыцыйнай тэхніцы выцінанка, і тут важныя і традыцыі народа, і іх разуменне ў сучасным свеце. Удзел у гэтым праекце — магчымасць паказаць традыцыі беларускага нацыянальнага мастацтва вялікай колькасці гледачоў.

Дарэчы, элементы мастацкай працы Вікторыі Паліўкі ўпрыгожваюць афіцыйную афішу гэтага сезона праекта. Карціну абраў мастацкі савет праекта як творчае ўвасабленне ідэі мерапрыемства, што мае адбыцца.

— Гэта адна з маіх першых карцін, дзе я пастаралася пераасэнсаваць традыцыі ў сучаснасць, — растлумачыла Вікторыя.

дызайнераў-пачаткоўцаў, — падзялілася ўражаннямі **дызайнер Алена АСТАПКІНА.** — У праекта склалася менавіта тая аўдыторыя гледачоў, якая здольная ацаніць ідэі дызайнера. У далейшым гэтыя людзі могуць стаць (і становяцца) кліентамі брэнда. Праект дае штуршок развіццю айчыннай моды, дазваляе большай колькасці людзей даведвацца пра айчынных дызайнераў.

У Беларусі ствараецца і адшываецца шмат прыгожага адзення, расказала дызайнер. І важна, каб пра новыя калекцыі і цікавыя новыя (і не новыя) брэнды даведвалася як мага больш людзей.

Напрыклад, існуе меркаванне, што ў нашай краіне — «прабел» у сферы мужчынскай моды: маўляў, яе фактычна няма. Але гэта не так: беларуская мужчынская мода ёсць, зазначыў **кіраўнік праекта «Тыдзень моды і сучаснага мастацтва ў Беларусі» Іван КАРАТКЕВІЧ:**

— Людміла Тараканава, Іван Айплатаў — тыя людзі, якія сапраўды робяць беларускую мужчынскую моду, — сказаў ён.

Ёсць і маладыя дызайнеры, што працуюць у гэтай сферы. Іншая справа, адзначыў Іван Караткевіч, што ў нашай краіне мужчынская мода прадстаўлена аўтарскімі рэчамі, у першую чаргу ад вядомых дызайнераў, таму мае і сваю спецыфіку, і пэўную цэнавую палітыку. І ўсё ж казаць, што яе няма, было б некарэктна.

Сярод імёнаў і брэндаў, якія адкрые гледачу юбілейны сезон праекта, адзен-


Фота носіць ілюстрацыйны характар.

### НОВЫЯ ІМЁНЫ

— За мінулыя гады нам пашчасціла супрацоўнічаць з вядомымі людзьмі мастацтва. Напрыклад, летась знакамітым госцем праекта стаў скульптар Максім Пятруль, — расказала **член савета Беларускага саюза дызайнераў Вольга ЗЯМСКОВА.**

Яна падкрэсліла, што сінтэз розных відаў мастацтва заўсёды быў часткай канцэпцыі фэшн-праекта.

— Першапачаткова была калабарацыя моды і тэатра: мадэлі спускаліся ў аркестравую яму, дызайнеры падымаліся на сцэну праз сцэнічныя люкі. Была ў нас і калабарацыя з вакальнымі і харэаграфічнымі выступленнямі. Зразумела, з выяўленчым мастацтвам, а таксама са скульптурай. У новым сезоне публіцы будзе прадстаўлена выстава работ мастакоў па кераміцы.

І ўсё ж «галоўнай гераіняй» фэшн-мерапрыемства ў Купалаўскім, зразумела, будзе мода. Удзень паказы будуць праходзіць у фармаце нон-стоп, прадугледжаны таксама вячэрнія паказы. Выставачны праект адкрыецца 11 мая ў 18.00. У цэлым, за ўвесь час работы праекта ўдзел у ім прынялі больш за 500 беларускіх дызайнераў.

— Гэты тыдзень моды ў некаторым родзе ўнікальны: ён дае выдатны старт для не розных цэнавых катэгорый, калекцыі з рознымі канцэпцыямі і «адрасатамі». У прыватнасці, можна будзе ўбачыць паказ брэнда, ідэя якога — «мадэлі для працоўных жанчын, што «адбыліся», дасягнулі пэўных поспехаў, але здольны ісці далей». Або, напрыклад, калекцыя верхняга адзення, куды аўтары заклалі ідэі эканакіраванасці і адказнага спажывання.

— Для нас удзел у Belarus Fashion Art Week — свайго роду ўзлётная паласа, выдатная магчымасць праявіць сябе і паказаць тыя сэнсы, што мы заклалі ў нашы калекцыі, — расказвае **дызайнер брэнда «Зіма» Алена БАЯРЧУК.** — Гэта эканакіраванасць і любоў да прыроды. Мы ствараем суперкласныя вырабы з экафутра, іншых матэрыялаў, якія можна насіць не адзін сезон, а пяць-шэсць. Яны застануцца моднымі, стыльнымі і актуальнымі.

Кожны сезон Belarus Fashion Art Week мае сваю тэму. Тэма майскага праекта-2024 — Натхненне. Крыніцай натхнення стане сінтэз тэатральнага мастацтва, старажытнай тэхнікі выцінанкі, жывапісу, дэкаратыўнай керамікі, мастацкага тэкстылю і, вядома ж, моды. Разам яны натхняць удзельнікаў і гледачоў на новыя творчыя адкрыцці.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Спорт-тайм

# Дарогу — маладым

## У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем цікавыя спартыўныя навіны

**ГЕРОЙ ТЫДНЯ.** Беларус Яўген Мораў стаў прызёрам юнацкага Кубка Еўропы па дзюдо. Гэта адзіны медаль для беларускай каманды. Яўген Мораў стаў прызёрам у катэгорыі больш чым 90 кг. Кубак Еўропы сярод юнакоў і дзяўчат па дзюдо праходзіў у азербайджанскім Гейгеле і сабраў звыш 320 юных спартсменаў з 14 краін.

**ГЕРАІНЯ ТЫДНЯ.** Вікторыя Нікалаева стала прызёрам Маладзёжнага чэмпіянату Еўропы па шашках-64, які праходзіў у горадзе Кемер (Турцыя). У хуткай праграме Вікторыя стала першай. Таксама яна заваявала бронзавыя медалі ў класічнай і вокамгненнай праграмах. Усяго ў спаборніцтвах узялі ўдзел 116 спартсменаў з дзевяці краін.



**КАМАНДА ТЫДНЯ.** Баскетбалісты юнацкай зборнай Беларусі (U-15) сталі пераможцамі міжнароднага турніру ў Бішкеку. У паядынку за першае месца беларусы перайгралі равеснікаў з Кыргызстана з лікам 63:38. Да гэтага яны перамаглі зборныя Узбекістана з вынікам 106:31, Казахстана — 98:27, расійскі СПб — 73:39 і ўзбекскі White Fox — 81:46. Акрамя таго, Алег Салей заваяваў тытул MVP спаборніцтваў, а Яраслаў Гесць — найлепшага гульца каманды. Аснову зборнай Беларусі складаюць гульцы з Рэспубліканскага дзяржаўнага вучылішча алімпійскага рэзерву.

**ПОСПЕХ ТЫДНЯ.** У Архангельску ў Цэнтры пляжных відаў спорту BORA BORA завяршыўся першы этап розыгрышу Кубка Расіі 2024 года па пляжным валейболе сярод мужчынскіх і жаночых каманд. Сярод мужчынскіх дуэтаў выступаў і беларускі ў складзе Аляксандра Дзядкова і Паўла Пятрушкі. Спартсмены сталі сярэбранымі прызёрамі турніру. У вырашальным фінальным матчы яны ўступілі сапернікам з Расіі ў двух сэтах — 21:13 і 21:14.

**ЛІЧБА ТЫДНЯ.** Восем медалёў заваявалі беларускія спартсмены на адкрытым чэмпіянаце Турцыі па плаванні. Аліна Змушко стала чэмпіёнкай на дыстанцыях 200, 50 і 100 метраў брасам. Ілья Шымановіч перамог на 200 метрах і 50 метрах брасам і стаў сярэбраным прызёрам на стометроўцы гэтым жа стылем. Анастасія Куляшова перамагала на 50 метрах батэрфляем і на спіне. Гэты турнір стаў для лідараў беларускай каманды адным з этапаў падрыхтоўкі да летніх Алімпійскіх гульняў: на гэты момант ліцэнзіі маюць Шымановіч і Змушко (абодва на сотні брасам), а таксама Анастасія Шкурдай (100 м і 200 м на спіне). На паездку ў Парыж прэтэндуе і Куляшова на дыстанцыі 100 м батэрфляем.

**АБ'ЯВА ТЫДНЯ.** Хакейны клуб «Дынама-Мінск» апублікаваў састаў каманды па стане на 1 мая 2024 года. Кантракты з «зубрамі» на наступны сезон Кантынентальнай хакейнай лігі маюць 26 хакеістаў — два галкіперы, шэсць гульцоў абароны і 18 нападаючых. Варатары: Ціхан Чайка, Ягор Вельмакін; абаронцы: Роберт Хэмілтан, Арсеній Брынкман, Мікіта Жыхараў, Ілья Сушко, Канстанцін Валочка, Мікіта Парфянюк; форварды: Раман Гарбуноў, Аляксандр Волкаў, Віталь Пінчук, Сяргей Кузняцоў, Ягор Борыкаў, Уладзіслаў Кадола, Данііл Сатышвілі, Андрэй Стась, Танер Фрыц, Сэм Энас, Данііл Ліпскі, Міраслаў Міхалёў, Сцяпан Звягін, Ягор Ігнаценка, Іван Сякерын, Вадзім Мароз, Цімафей Каўгарэня. Кваліфікацыйныя прапановы на заключэнне новых пагадненняў атрымалі выступаючыя за «Дынама» ў сезоне 2023/24 Дзмітрый Дзярабін, Мікіта Пышкайла, Нік Мерклі і Валянцін Дземчанка. Аналагічную прапанову атрымаў форвард «Сірак'юз Кранч» з АХЛ Ілья Усаў. Акрамя таго, было працягнута дзеянне правоў у КХЛ на варатара Аляксея Коласава і форвардаў Ягора Сідарава і Данііла Боўраша, якія цяпер выступаюць у Паўночнай Амерыцы. На рынак свабодных агентаў выйшлі галкіпер Дылан Фергюсан, абаронцы Яні Калдзіс, Кодзі Керан, Ілья Шынкевіч і Дзмітрый Корабаў, а таксама нападаючыя Брэт Рычы, Вячаслаў Асновін і Аляксандр Сувораў.

**ТУРНІР ТЫДНЯ.** На «Барыс-Арэне» ў Астане завяршыўся міжнародны турнір па хакеі Qazaqstan Hockey Open-2024 з удзелам зборных Беларусі, Казахстана і Расіі 25. У фінале сустрэліся зборныя Беларусі і Расіі 25. Паядынак у выніку скончыўся перамогай расіян з лікам 6:0, беларусы занялі на турніры другое месца. Далей нашу каманду чакаюць яшчэ тры паядынкі супраць Расіі 25 у рамках серыі «Ліга Ставак. Вялікі тур зборнай». 6 мая каманды сустрэнуцца ў Омску, 9 мая згуляюць у Туле, а 11 мая завершаць сезон матчам на «Мінск-Арэне».

**ПАЗІЦЫЯ ТЫДНЯ.** Арына Сабаленка захавала другі радок у рэйтынгу Жаночай тэніснай асацыяцыі. У актыве беларускай тэнісісткі 7498 балаў. На першым месцы польская спартсменка Іга Свёнтак, якая мае 10910 рэйтынгавых балаў. Менавіта польскай тэнісістцы Арына Сабаленка ўступіла ў фінале WTA-1000 турніру ў Мадрыдзе. Вынік сустрэчы дзвюх лепшых тэнісістак свету 6:3, 3:6, 6:3.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

## 7 МАЯ — Даты — Падзеі — Людзі

У краіне

**1919** год — нарадзіўся (в. Рэкта, цяпер у Горацкім раёне) Георгій Шчарбатаў, беларускі пісьменнік. Да вайны працаваў настаўнікам, у рэдакцыях газет «Камунар Магілёўшчыны», «Советская Белоруссия». З 1942 года ў тыле ворага — карэспандэнт газеты «Савецкая Беларусь», з 1943 года — у рэдакцыях газет «Звязда», «Известия» па Беларусі, быў загадчыкам аддзела, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць». Аўтар запісак «Партызанскія агні», аповесці «Шумелі пушчы», нарысаў «Камсамол Беларусі ў баях за Радзіму», «Неспакойныя сэрцы», апавяданняў.

**1929** год — нарадзіўся (в. Доўск Рагачоўскага раёна) Яўген Аляксандравіч Казлоўскі, савецкі дзяржаўны дзеяч і вучоны-геолаг, доктар тэхнічных навук, прафесар, У 1965—1972 гадах — начальнік упраўлення Міністэрства геалогіі СССР, з 1974-га — намеснік міністра, у 1975—1989-м — міністр геалогіі СССР. Аўтар навуковых работ па метадах і тэхніцы разведкі карысных выкапняў, аптымізацыі геолагаразведачных працэсаў, тэхніка-тэхналагічным забеспячэнні геалагічных даследаванняў, глыбіннай будове зямной кары і звышглыбокім свідраванні, геалагічных праблемах навакольнага асяроддзя, прынцыпах развіцця і выкарыстання мінеральна-сыравіннай базы СССР і свету. Лаўрэат Ленінскай прэміі.

**1942** год — у Аляксандраўскім скверы ў Мінску фашысты павесілі 28 чалавек — удзельнікаў мінскага патрыятычнага падполля. Сярод іх — Ісай Казінец.



У свеце



**1833** год — нарадзіўся Іаганес Брамс, нямецкі кампазітар і піяніст, адзін з вядучых музыкантаў перыяду рамантызму.

**1840** год — нарадзіўся Пётр Чайкоўскі, рускі кампазітар, дырыжор, педагог.

**1952** год — Джэфры Думер прэзентаваў канцэпцыю інтэгральнай схемы, што пасля лягла ў аснову ўсіх сучасных камп'ютараў.

**1999** год — Папа Рымскі ўпершыню з часоў падзелу хрысціянства (1054) наведаў праваслаўную краіну — Румынію.

Так гаварыў...

**ГАБРЫЭЛЬ МАРКЕС:**

*«Умей цаніць таго, хто без цябе не можа, не ганіся за тым, хто шчаслівы і без цябе».*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.21 | 20.52 | 15.31 |
| Віцебск — | 5.05 | 20.47 | 15.42 |
| Магілёў — | 5.11 | 20.43 | 15.32 |
| Гомель — | 5.14 | 20.33 | 15.19 |
| Гродна — | 5.37 | 21.07 | 15.30 |
| Брэст — | 5.44 | 21.01 | 15.17 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 1 мая.*

*Месяц у сузор'і Цяльца.*

**Імяніны**

*Пр. Елізаветы, Аляксандра, Аўсея, Аляксея, Валянціна, Савы, Фамы.*

*К. Людмілы, Розы, Бенядзікта, Вінцэнта, Людаміра.*


Фота Ірыны ТАМКОВІЧ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Я не п'ю і не куру!

— Так, пачакай. Я бачыў, як ты курыў!

— Ну дык гэта па п'яні...

**Муж — жонцы:**

**— А вось што ты будзеш рабіць, калі ўбачыш, як я цалуюся з іншай жанчынай?**

**— Ну што... Як верная жонка наведваць цябе буду... У траўматалогіі...**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 10.736. Індэкс 63850. Зак. № 1078.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 6 мая 2024 года.